ПРОЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

РАБОТНІЦА і КАЛГАСНІЦА БЕЛАРУСІ

ТРЫУМФ СОВЕЦКАГА НАРОДА

Дзень зварота ў Маскву адважных папанінцаў, пераможцаў Паўночнага полюса, увойдзе яркай старонкай у гісторыю нашай радзімы, у гісторыю вялікіх заваёў соцыялізма. Трыумфальную сустрэчу наладзіла ўчора Масква адважным сынам нашай радзімы—Папаніну, Шыршову, Крэнкелю, Фёдараву.

Дзевяць месяцаў назад чатыры совецкіх чалавекі ўзнялі над Паўночным полюсам сцяг нашай вялікай дзяржавы, сцяг Сталіна, вобраз якога служыў пуцяводнай зоркай у барацьбе і перамозе нашых братоў. Учарашняя сустрэча ў Маскве папанінцаў—гэта велічны апафеоз гераічнага подвіга адважнай чацвёркі, носьбітаў прагрэса і культуры. Героі—папанінцы і адважныя маракі праследвалі па вуліцах Масквы, горача вітаемыя народам. Яны былі на прыёме ў Крэмлі, на сустрэчы з кіраўнікамі партыі і ўрада. Яны вярнуліся ў Маскву з пераможным сцягам, звярнуліся на радзіму з далёкага арктычнага пахода, каб проста і коратка сказаць партыі, ураду, свайму народу: „Сталінскае заданне выканана. Полюс заваяваны большэвікамі".

Сцяг, абвеяны ўсімі паўночнымі вятрамі, чырвоны сцяг, горда лунаўшы над полюсам, папанінцы ўручылі таварышу Сталіну.

Бясстрашшу адважных папанінцаў пяем мы славу! Яны зрабілі подвіг, бяспрыкладны ў гісторыі чалавецтва, яны паказалі ўсяму свету высокія маральныя якасці совецкіх людзей — ідэйнасць, благароднасць і бескарыснае служэнне навуцы. Сапраўды, перамога папанінцаў—гэта трыумф усяго совецкага народа, трыумф партыі Леніна—Сталіна, нястомна выхоўваючай у народзе любоў і адданасць радзіме.

Які народ, такія і героі яго. Нашы совецкія героі не ўзвышаюцца, не шэствуюць дзесьці над натоўпам... Не, яны выйшлі з народа, яны—плоць ад плоці рабочых, сялян, інтэлігенцыі, яны выхаваны большэвіцкай партыяй, якая ўсяліла ў іх упэўненасць у свае ўласныя сілы, навучыла іх даражыць давер'ем народа. Калі ў дні чэлюскінскай эпапеі совецкія людзі спакойна, без малейшай панікі высадзіліся і абгрунтаваліся на крызе, калі Вадап'янаў, Молакаў, Аляксееў першымі спусціліся на полюсе, калі Чкалаў, Громаў зрабілі гераічны скачок з Масквы ў Злучаныя Штаты Амерыкі, калі папанінцы на працягу дзевяці месяцаў упарта і непахісна асвайвалі Арктыку—усімі імі кіравала адно жаданне—перамагчы.

Усе яны цвёрда ведалі: за імі—радзіма, 170-мільённы народ, Сталін. Маральнае і палітычнае адзінства совецкага народа,—якая гэта грозная для ворагаў і ў той-жа час, якая гэта вялікая, цудоўная сіла, узнімаючая скромных і непрыкметных людзей на подвігі, нараджаючая тысячы і тысячы совецкіх герояў!..

Совецкі народ ацаніў цяжкасці, гераізм і мужнасць сваіх сумленных, скромных і благародных сыноў. Усё было зроблена, каб зняць папанінцаў з дрэйфуючай крыгі. У Грэнландскае мора быў накіраван „Мурманец", за ім „Таймыр", потым „Мурман" і „Ермак".

Буржуазія апашляе чалавечыя помыслы, расцэньвае пачуцці людзей, іх якасці ў доларах і фунтах. Для нас гэта не крытэрый. Партыя Леніна—Сталіна вучыць нас высока цаніць гераізм, талент, энергію і адвагу. Нашым героям цаны няма! Людзям таленавітым і здольным, людзям бязмежна любячым партыю, радзіму, у нашай краіне адкрыты ўсе шляхі.

Сталінская эпоха ўзвышае чалавека—самы каштоўны капітал у свеце,—раскрывае перад чалавекам шырокія гарызонты творчасці, акрыляючы яго на адважныя справы і наватарства ва ўсіх галінах жыцця, працы і навукі. Стагоддзямі песціла чалавецтва мару аб заваяванні полюса. Туды, да цэнтра цвярдыні Палярнага басейна, да вяршыні зямнога шара, заўсёды былі накіраваны думкі і імкненні лепшых прадстаўнікоў чалавецтва. Смелыя, адважныя даследчыкі і мараплавацелі дзейнічалі на свой страх і рызыку. Адзінокія ў сваёй барацьбе са стыхіяй, яны цярпелі крах, усе іх мары і планы рушыліся ў атмасферы паўнейшага роўнадушша капіталістычнага грамадства.

Заваяванне полюса — гэта іспалінская задача аказалася па плячу совецкай дзяржаве, у якой свабодная асоба дзейнічае у поўнай гармоніі з грамадствам. Большэвікі заваявалі полюс таму, што яны дзейнічалі па плану, выпрацаванаму партыяй, таварышам Сталіным, таму, што яны заваёўвалі перамогу, спалучаючы рускі рэволюцыйны размах з амерыканскай дзелавітасцю.

Дух гераізма, дух мужнасці і адвагі ўласцівы вялікаму совецкаму народу. Папанінец—гэта сімвал бясстрашша, бязмежнай любві к Сталінскаму Цэнтральнаму Камітэту і Совецкаму ўраду. Характар, думкі і паводзіны чатырох совецкіх даследчыкаў раскрываюцца ў скупых запісах нядаўна апублікаванага дзенніка Героя Совецкага Саюза І. Д. Папаніна. 28 ліпеня 1937 г. Крэнкель паведаміў сваім таварышам, што ўсе чацвёра узнагароджаны ўрадам высокімі ўзнагародамі. „Калі ён сказаў гэта,—запісана ў дзенніку Папаніна,—у мяне ад радасці слёзы нацяклі. Наш любімы Іосіф Вісарыёнавіч назваў нас гераічнымі зімоўшчыкамі. Пастараемся апраўдаць гэту назву.

Я падняў тост за здароўе роднага Іосіфа Вісарыёнавіча. Мы пацалавалі адзін другога і павіншавалі, далі клятву працаваць і працаваць, не шкадуючы жыцця, каб апраўдаць аказанае нам давер'е".

Апраўдаць давер'е партыі і народа—гэта самае галоўнае ў нашым жыцці! У нашых героях, пераможцах полюса, мы бачым саміх сябе—вялікі совецкі народ, благародны, мудры, адважны і энергічны. Гора таму, хто ўздумае падняць руку на гонар і незалежнасць Совецкага Саюза. Любы вораг будзе раздаўлен, як жалкі пігмей. Народ, выхаваўшы герояў-папанінцаў,—такі народ непераможны!

Совецкі Саюз рушыць уперад культуру і цывілізацыю. Ён указвае ўсяму чалавецтву шлях да новага жыцця, ён узвышаецца над светам, як маяк, як надзея мільёнаў працоўных. Слава аб подвігах совецкіх багатыроў пранікае ва ўсе

На вокладцы ўверсе: І. Д. Папанін выступае на мітынгу ў Ленінградскім парту. Унізе: сустрэча папанінцаў.

куткі зямнога шара, зварачае погляды працоўных у бок Масквы—вялікай калыбелі новага чалавецтва. А якія героі ззяюць на буржуазным небасхіле, якімі подвігамі ўзбагачае чалавецтва капіталістычны свет? Бамбардыроўкай мірных іспанскіх і кітайскіх гарадоў і паселішчаў, забойствамі тысяч і тысяч рабочых, сялян і інтэлігенцыі. Фашысцкія драпежнікі рыскаюць у Іспаніі, Кітаі, Аўстрыі, сеючы ўсюды смерць, нясучы з сабой варварства і мракабессе.

Толькі комунізм нясе людзям радасць і шчасце, клопаты аб тварцах новага жыцця, якія любоўна будуюць сваю культуру, пакараюць прыроду, робяць велічныя подвігі для дабра мільёнаў. Большэвікі заваявалі полюс! Новыя, вялікія і выдатныя справы і пачынанні прадстаіць выканаць людзям нашай радзімы. Новымі і новымі подвігамі, упартай, актыўнай, творчай работай на ўсіх фронтах соцыялістычнага будаўніцтва яшчэ больш уславім нашу радзіму, якую вядзе к поўнаму таржаству комунізма жалезная кагорта большэвікоў, вялікая партыя Леніна—Сталіна!

(„Правда“)

На здымку: Сустрэча папанінцаў. Герой Совецкага Саюза І. Д.Папанін з жонкай праязджае на аўтамашыне па вуліцах Ленінграда, вітаемы працоўнымі горада.

Фота Ласкутова.

ПАПАНІНЦЫ

То ні казка, ні сказ, ні паданне,
Ходзіць з вуснаў у вусны
людзей...
У стагоддзях свайго існавання
Свет не ведаў падобных падзей!

На пустыннае, грознае поле,
Дзе адвеку шалее пурга,
Дзе яшчэ нічыя і ніколі
Не ступала людская нага.

На Паўночны нязведаны полюс
З багатырскай Вялікай зямлі
Гартаваныя сталінскай воляй
Вы, чатыры героі, прышлі.

На абломанай льдзіне, ў тумане,
У абдымках вятроў і завей,
Правялі вы ў сваім вандраванні,
Дзвесце семдзесят дзён і начэй.

Вам насіла палярная цемень
Небяспеку ў грудзях ледзяных,
Вы плылі, як у казцы-паэме,
Ад вясны і да самай вясны!

Вам крэмлёўскія брамы
адкрыты!..
Дзвесці семдзесят дзён і начэй
Вы не бачылі ў небе блакіта,
Вы не бачылі блізкіх людзей.

Хвалі неслі вас рокатным
шквалам,
Да грэнландскіх сляпых берагоў,
Вас, герояў, радзіма натхняла,
Сагравала вас наша любоў.

Вы стыхію прыроды скарылі,
Разгадалі вы сілу яе.
Неўміручаю славай пакрылі
Баявыя імёны свае.

Большэвіцкага племя героі,
Неўстрашымай радзімы сыны,
Ваша слава узышла над зямлёю.
Як вясёлае сонца вясны!

Андрэй Александровіч.

Рускія людзі,

Совецкія людзі

Цяпер такая вялікая радасць, што гэтых мілых людзей хочацца проста абняць і толькі сказаць ім:

— Ну, вось вы і прыехалі.

Вельмі цяжка разважаць аб іх стрымана, спакойна, даваць характарыстыкі і ім, і іх плаванню на крызе, і ўсяму таму, што яны характарызуюць, што яны выказваюць сваім жыццём, сваёй работай, сваімі характарамі.

Але яны ўжо пайшлі нам насустрач, і самі лепш, чым хто-б там ні было, напісалі аб сабе, адзін аб адным.

За апошнія гады я нічога не чытаў лепшага з новай літаратуры, чым дзённікі Папаніна і яго спадарожнікаў. Гэта гаворыцца абсалютна без усякага пераўвялічэння, без малейшага жадання гаварыць камплімenты. Чацвёрка жыхароў Паўночнага полюса мае столькі асабістых вартасцей, што зусім не абавязана быць да ўсяго яшчэ чацвёркай пісьменнікаў.

Не абавязана, але аказалася калектывам выдатных літаратараў, у якога маглі-б што-колечы павучыцца многія з нас,—гэта таксама без усялякага пераўвялічэння.

Можа быць, самая абстаноўка, месцапалажэнне, холад, небяспекі, цяжкасць працэса пісьма, абмежаванасць сіл радыёперадатчыка наклалі адбітак на выдатны, сціслы, мужны стыль гэтых аўтараў. Але прычына раней за ўсё, зразумела, у самай прыродзе людзей, іх поўнакаштоўнасці, гарманічнасці, скромнасці, вартасці.

Запісы Папаніна здзіўляюць кароткасцю, вычарпальнай яснасцю, незвычайным, зусім не паказным, а глыбокім, шчырым, абгрунтаваным аптымізмам нават у самыя цяжкія, небяспечныя моманты. А галоўнае—велізарнай змястоўнасцю. Запісы за 23 верасня гавораць:

„К абеду прыгатавалі смачныя блінчыкі, запівалі іх кофе".

Больш нічога за 23 верасня не запісана. І больш нічога не патрабуецца. У адным сказе мы бачым увесь дзень, дзень толькі па назве, правільней, суткі суцэльнай беспрасветнай палярнай начы, чацверых людзей, згубленых у цемры, у вечных крыгах, з марскай вадой на тры кілометра ў глыбіню пад нагамі, прыціснуўшыхся адзін да другога ў малюсенькай палатцы, у траскучы мароз, і іх маленькая падзея: блінчыкі, падсмажаныя на маленькай печцы, з'едзеныя на каленях, падзея, адзіная за ўсе гэтыя крамешныя суткі на краю света... Выдатны пісьменнік Іван Папанін!

Аб Крэнкелі і гаварыць няма чаго. Гэта прыроджаны, выдатны журналіст, з энергічным, жывым, насмешлівым стылем, знаходлівы, маляўнічы, поўны лірыкі і юмара.

У адносінах юмара трэба наогул павіншаваць папанінскую чацвёрку—яна даравіта ім у збытку. А гэта-ж на полюсе неабходнейшая рэч, не менш важная, чым вітаміны і акумулятары. Дакладней кажучы—юмар нясгомна папаўняў акумулятары бадзёрасці і трываласці адважнай дружыны.

„Адчуў сябе дрэнна,—піша Папанін,—мяне трасе, ногі ломіць". Захварэць на Паўночным полюсе—прыемнасць невялікая. Але Папанін тут-жа хмура жартуе над „доктарам" Пятром Пятровічам Шыршовым.

„Наконт хірургіі думаць не прыходзіцца, хоць Пятровіч набраў многа медыцынскіх нажоў, іголак і раней практыкаваўся з доктарам Чэчуліным у бальніцы: ён рэзаў нарывы на пальцах, купляў два-тры кілограмы мяса і дома рэзаў яго і сшываў. Не, лепш не пападацца ў рукі Пятра Пятровіча".

На здымку: Гераічная чацвёрка тт. Папанін, Крэнкель, Шыршоў і Фёдараў на полюсе сустракаюць удзельнікаў экспедыцыі „Таймыра" і „Мурман".

Рэпрадукцыя Шышко (БСФ).

А Крэнкель, гаворачы аб сваім радыёперадатчыку, усклікае:

„Хто яшчэ з радыстаў можа пахваліцца, што яго радыёстанцыю абслугоўваў рухавік, які складаецца з трох дэпутатаў совецкага парламента, уладальнікаў шасці ордэнаў!“

Амаль поўвека ва многіх краінах света была настольная, цікавая кніга Джэрома „Трое ў лодцы акрамя сабакі“—яна апісвала бездапаможнасць гарадскіх людзей, уздумаўшых бегчы да прыроды і падарожнічаць без дапамогі выгод цывілізацыі. Якая шкада, што кніжка аб гэтых смешных буржуазных дзіваках не папала на полюс да чацвёркі соцыялістычных Рабінзонаў,—колькі вясёлых мінут яна даставіла-б Папаніну і Крэнкелю, Фёдараву і Шыршову!

Але ў перажываннях і запісах жыхароў крыгі далёка не ўсё ўспрымаецца жартаўлівай. Вазьміце будні іх работы—у спакойных, бліскучых па форме шыршоўскіх і фёдараўскіх запісах. Колькі самаафярнасці, колькі гераізма для навукі, для радзімы! І той-жа Папанін,—ён прысвячае запіс за 30 кастрычніка, некалькі скупых і бацькоўска цёплых слоў, сваім маладым падарожнікам-вучоным:

„Пётр Пятровіч з рання не мог нічога рабіць. Ён хацеў пераганяць ваду для лабараторных работ, але мароз павялічыўся да 36 градусаў. Нельга было доўга знаходзіцца ў ледзяной кухні. Ён прышоў у палатку і пачаў займацца англійскай мовай. Шкада глядзець на Жэню, які гадзінамі сядзіць у сваёй ледзяной абсерваторыі...“

І потым, у дні самай вялікай небяспекі, калі раскалолася крыга,—ні адной скаргі, ні адной ноткі трывогі, і толькі адзін раз скрозь зубы, некалькі сказаў:

„Паслалі тэлеграму сем'ям, каб яны не трывожыліся, а то яны яшчэ, чаго добрага, пачнуць думаць, што мы тут гінем. З'явілася сонца. Мы вышлі з палаткі і сабраліся каля рэчаў. Тэадорыч паглядзеў на нас і сказаў:—Якія вы ўсе страшэнныя, змучаныя, жоўтыя. У цемры было непрыкметна. Цікава, на кого я сам падобны“.

І на другі-ж дзень зноў звычайна, роўна:

„Ноч прайшла ціха, без штуршкоў, Тэадорыч добра зарадзіў акумулятары для радыё і навуковых работ. Завялі патэфон, з задавальненнем слухалі музыку. Працерлі мокрай трапкай твары, неяк пасвяжэлі...“

П. П. Шыршоў з сынам Алікам. (Саюзфото).

Мы ведаем, увесь свет, літаральна ўвесь свет без усялякіх выключэнняў, пракланіўся перад гераізмам, перад доблесцю папанінскай чацверкі. Увесь свет, уключаючы і ворагаў. Але ворагі застаюцца ворагамі. Яны стараюцца па-свойму вытлумачваць трыумф фантастычна смелай совецкай палярнай экспедыцыі ад полюса на крызе. Яны тлумачаць: Папанін, Крэнкель, Шыршоў, Фёдараў—гэта проста адважныя рускія людзі, поспех іх—гэта поспех рускага нацыянальнага маладзецтва, і нічога спецыяльна совецкага, большэвіцкага ў ім няма.

У гэтай бяссільнай, нікчэмнай спробе „растлумачыць“ — лепшыя напаміны ўсяго значэння папанінскага трыумфа.

Так, чацверка на крызе—гэта рускія людзі, але калі, як не іменна пад сцягам большэвізма, пад ленінскім і сталінскім сцягам, рускі народ і ўсе народы былой каланіяльнай царскай імперыі разгарнулі свае нацыянальныя таленты і доблесці, калі, як не цяпер, знайшлі шырокія свабодныя шляхі, велізарную арэну для сваіх здольнасцей, кемнасці, гераізма, вынаходніцтва, размаха? Раней расійскія самародкі прабіваліся на паверхню адзінкамі,—цяпер за дзве сталінскія пяцігодкі свет даведаўся аб Громавых, Стаханавых, Чкалавых, Рычаговых, Папанінных, Гудавых.

І гэтыя людзі, гэтыя сусветна ўслаўленыя падарожнікі, даследчыкі, лётчыкі, нясуць у арганічным злучэнні рускае і большэвіцкае, асабістае і сталінскае. Таму Папанін піша 28 кастрычніка на крызе:

„Слухалі па радыё, як у нас краіна вылучае кандыдатаў у дэпутаты Вярхоўнага Совета. Радасна б'ецца сэрца, калі чуеш, што ўсе гатовы аддаць свае галасы за роднага, любімага таварыша Сталіна“.

... Любы Іван Дзімітрыевіч! Як мы ўсміхаемся, і як мы разумеем вашы радкі ў апошнім запісу 19 лютага: „...Наша апошняя раніца на станцыі „Паўночны полюс“. І радасна і той-жа час трохі сумна расставацца з крыгай, абжытай намі“.

Абжылі крыгу,—ну, што за людзі! І на самой справе шкада гэту добрую, нашанскую крыгу. Няўжо так-такі нельга было захапіць з сабой, паставіць у Маскве, у Музеі рэволюцыі?

Міхаіл Кальцоў („Правда“).

СМЕЛА І РАШУЧА ВЫЛУЧАЦЬ ЖАНЧЫН

За апошні час па БССР, як і па ўсёй нашай вялікай краіне, вылучаны на кіруючыя работы з самой гушчы мас радавыя жанчыны—актыўныя ўдзельніцы соцыялістычнага будаўніцтва. Сярод вылучаных новых кадраў многа палкіх патрыётак нашай радзімы, энтузіястак соцыялістычнай працы.

У нашай краіне, як ні ў адной другой краіне, маюць поўную магчымасць выяўляцца таленты, героі, стаханаўкі з заводаў, калгасаў і соўгасаў. Гэтым людзям адкрыты шырокія дарогі для прымянення іх творчай і арганізацыйнай здольнасці ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

Ворагі народа шпіёны, дыверсанты, нацыянал-фашысты і шкоднікі, якія арудвалі ў Беларусі з мэтай захаваць свае „незамянімыя" кадры, распаўсюджвалі антысовецкую тэорыю аб адсутнасці кадраў.

Ворагі народа, як агню баяліся вылучэння новых людзей, якія-б маглі ўліць новую струю ў работу. З асаблівай варожасцю яны адносіліся да жаночых кадраў і складалі ім невыносныя ўмовы ў рабоце.

Раскрыццё і разгром гэтых наймітаў з польскай ахранкі адкрыла глыбачэйшыя магчымасці для вылучэння на кіруючую работу з гушчы народных мас лепшых жанчын нашай радзімы, якія да канца адданы справе партыі і яе правадыру таварышу **Сталіну.**

Выбары ў Вярхоўны Совет СССР выявілі невычарпальныя рэзервы жаночых кадраў для вылучэння. Некалькі дзесяткаў тысяч жанчын, якія ўдзельнічалі ў правядзенні агітацыйна-масавай работы ў БССР, паказалі сваю бязмежную адданасць справе партыі. Яны былі палкія агітатары за нераможны блок комуністаў і беспартыйных, неслі ў масы жывыя большэвіцкія словы.

Смелае і рашучае вылучэнне перадавых жанчын на кіруючую работу паказала, што гэта вылучэнне поўнасцю сябе апраўдала. Для прыклада можна прывесці некалькі фактаў, якія з усёй відавочнасцю аб гэтым сведчаць.

Былы старшыня сельсовета тав. Лёліна—дэпутат Вярхоўнага Совета СССР—вылучана старшынёй Асіпавіцкага Райвыканкома. Кіраўніком соцыялістычнага прадпрыемства, намеснікам фабрыкі „Профінтэрн" (гор. Віцебск) вылучана дэпутат Вярхоўнага Совета, былая работніца—стаханаўка фабрыкі імя Кагановіча тав. Багачова. Пасля выкрыцця ворагаў народа, якія сядзелі на чале кіраўніцтва Смілавіцкага РВК, аднадушна абрана старшынёй РВК тав. Якуш Поля. Абрана таксама старшынёй Пухавіцкага РВК тав. Жур.

Мы маем у Беларусі жанчын, якія кіруюць раённымі партыйнымі арганізацыямі. Сакратар Бабруйскага РК КП(б)Б—тав. Якушава, Бягомльскага—тав. Жукава, Магілеўскага—тав. Мазурова карыстаюцца вялікім аўтарытэтам і павагай сярод партыйных арганізацый.

Прыкладам смелага вылучэння жаночых кадраў з'яўляецца Церахоўскі райком партыі і Райвыканком. Там за апошні час на совецкую работу старшынямі сельсовета і работнікамі РВК вылучана 6 жанчын, з агульнага ліку вылучэнцаў 13 чалавек.

Але ўся праробленая работа па вылучэнню жаночых кадраў з'яўляецца яшчэ першымі нязначнымі крокамі. Нельга абыйсці тых буйнейшых недахопаў, якія маюцца ў недаацэнцы вылучэння жаночых кадраў з боку некаторых кіраўнікоў партыйных, совецкіх і прафесіянальных арганізацый, якое часам мяжуецца з прамым ігнараваннем важнейшых указанняў партыі па гэтаму пытанню.

Як расцэньваць такі факт, калі з атрыманых ЦВК БССР вестак аб вылучэнні новых кадраў па 50 раёнах Беларусі ў 28 раёнах не вылучана ні адной жанчыны? У такіх раёнах, як Аршанскі, Менскі, Віцебскі горсовет, Мозырскі і інш. не знайшлі ў раёне ні адной жанчыны для вылучэння на совецкую работу.

Характэрным у безадказных адносінах да вылучэння жаночых кадраў з'яўляюцца Менскі РК КП(б)Б, Райвыканком і Райза. Яны гатовы прызнаць свае цяжкія памылкі ў бяздзейнасці па вылучэнню жаночых кадраў. Аднак палец аб палец не ўдараюць, каб заняцца гэтым пытаннем. У Менскім Райза нават не ведаюць, колькі ў іх жанчын—загадчыц ферм, не гаворачы ўжо аб тым, што не ведаюць людзей, як яны працуюць. Бессаромна заяўляюць, што гэта не ўваходзіць у іх абавязак.

Менскі Райза не з'яўляецца выключэннем, ён варты сваіх кіраўнікоў з Наркамзема. Яны лічаць лішнім выхоўваць і кіраваць жанчынамі, якія стаяць у кіраўніцтве калгасаў. У іх нават няма такога ўчота.

ЦВК БССР таксама мала зрабіў для таго, каб райвыканкомы больш рашуча і смела вылучалі жанчын з партыйных і непартыйных большэвікоў на кіруючую работу ў Совецкі апарат.

У нас часта абмяжоўваюцца фармальным вылучэннем людзей, а далей іх лёсам не цікавяцца. Забываюць, што пасля вылучэння трэба штодзённа практычна дапамагаць, выхоўваць і клапатліва вучыць вылучэнак на рабоце.

Узяць хоць-бы такі факт: Тав. Бойка Елена—брыгадзір калгаса „X год Кастрычніка", Старадарожскага раёна адна з лепшых брыгадзіраў у раёне. У мінулым годзе праўленне калгаса зняла яе з пасады толькі за тое, што ў яе грудное дзіцё. Пасля ўмяшання ў гэту справу райкома партыі тав. Бойка была адноўлена на рабоце. А праз некаторы час зноў была з работы знята.

Такое становішча з вылучэннем жаночых кадраў нецярпіма. Неабходна памятаць аб пастанове ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб нечарназёмнай паласе (ад 19 снежня 1935 года), у якой запісана: „Соўнарком СССР і ЦК ВКП(б) ставяць задачу перад крайкомамі і абкомамі, абласнымі і краявымі выканкомамі нечарназёмнай паласы, перад Соўнаркомам і ЦК КП(б)Б БССР—дабіцца на працягу бліжэйшых 1—2 год, каб значная частка старшынь калгасаў, калгасных брыгадзіраў, трактарыстаў, камбайнераў і працуючых на трактарных машынах па ільну і бульбе, калгасных рахункаводаў і загадчыкаў калгасна-таварнымі фермамі былі-б **жанчыны-калгасніцы".**

Камандзір вытворчасці

У 1930 г. чорнарабочай прышла на фабрыку „Сцяг Індустрыялізацыі“ Ефрасіння Пятроўна Шакінка. Дачка старага чыгуначніка, Ефрасіння Пятроўна цяпер кіраўнік-гаспадарнік. Сёння Тав. Шакінка ўжо з'яўляецца намеснікам дырэктара аднаго з буйнейшых у Саюзе прадпрыемства швейнай прамысловасці. Скромная радавая, беспартыйная работніца, яна выросла і выхоўвалася ў сценах соцыялістычнай фабрыкі.

Сямідзесяцігадовая старуха маці ніяк не можа нарадавацца сваёй дачкой. Старая жанчына, прашоўшы цяжкую школу жыцця, вельмі рада, што яе Фруза жыве шчасліва. Яе Фруза паважаны чалавек на фабрыцы—намеснік дырэктара буйнейшага прадпрыемства. І слёзы радасці і шчасця сочацца з яе вачэй.

Ефрасіння Пятроўна на вытворчасці заўсёды была прыкладнай, прагна вучылася і авалодвала тэхнікай. Першым ініцыятарам пахода за аўладанне тэхнікі на фабрыцы была яна. Адзін з першых значкоў „ЗОТ“ на фабрыцы ўпрыгожыў яе грудзі. Дырэкцыя фабрыкі заўважыла маладую здольную работніцу. У 1934 г. яе паслалі на вучобу—на 6-месячныя курсы брыгадзіраў швейнай прамысловасці пры Віцебскім швейна-тэкстыльным тэхнікуме. Тав. Шакінка выдатна скончыла курсы. У 1935 г., калі стаханаўскі рух пачаў ахопліваць нашу краіну, тав. Шакінка, будучы брыгадзірам ленты касцюмнага цэха, узялася за стварэнне ўсіх умоў для стаханаўскай работы. Ужо ў канцы 1935 г. яе брыгада была суцэльна стаханаўскай. Яна-ж была ініцыятарам соцыялістычнага спаборніцтва брыгад фабрыкі за права называцца імем таварыша Сталіна. І гэта ганаровае званне яе брыгада атрымала адной з першых.

У кастрычніку 1937 г. таварыш Шакінка была вылучана на пасаду намесніка дырэктара. І зараз кіруе фабрыкай.

— Недахопаў у рабоце маёй яшчэ вельмі многа,—гаворыць Ефрасіння Пятроўна.—Але аказанае мне велізарнае давер'е апраўдаю.

Упэўненасць, а галоўнае вучоба ў стаханаўцаў, у спецыялістаў, інжынераў дапамагае ёй у рабоце.

Ефрасіння Пятроўна самастойна рашае складаныя пытанні работы фабрыкі. Яна зараз працуе над тым, каб хутчэй ператварыць сваю фабрыку ў суцэльна стаханаўскае прадпрыемства. І гэтага яна пры падтрымцы ўсёй фабрычнай грамадскасці безумоўна дабʻецца. Фабрыка выканала план за першыя месяцы 1938 г. паспяхова.

— Малавата ведаў у мяне, — часта заўважае Ефрасіння Пятроўна.— Вучыцца я вельмі жадаю. Мару аб Прамысловай Акадэміі.

І можна не сумнявацца, што заветная мара яе ажыццявіцца,—тав. Шакінка будзе вучыцца ў Акадэміі.

Цяпер тав. Шакінка спачуваючая. Яна падала заяву аб прыёме яе ў кандыдаты партыі, каб сваё жыццё, свой лёс назаўсёды звязаць з партыяй Леніна–Сталіна, той партыяй, якая адкрыла цудоўны шлях у жыццё мільёнам жанчын совецкай краіны і назаўсёды замацавала за імі ў Сталінскай Канстытуцыі велізарнейшыя правы. Плады гэтых вялікіх правоў увасоблены ў самай Ефрасінні Пятроўне — дачцы свайго вялікага народа, узняўшайся з самых нізоў на камандную вышыню.

Вл. Вольны, А. Знаменскі.

Віцебск.

ЛЮДЗЕЙ ЗДОЛЬНЫХ, ЛЮДЗЕЙ ТАЛЕНАВІТЫХ У НАС ДЗЕСЯТКІ ТЫСЯЧ. ТРЭБА ТОЛЬКІ ІХ ВЕДАЦЬ І СВОЕЧАСОВА ВЫЛУЧАЦЬ, КАБ ЯНЫ НЕ ПЕРАСТАЙВАЛІ НА СТАРЫМ МЕСЦЫ І НЕ ПАЧЫНАЛІ ГНІЦЬ.

(І. СТАЛІН)

НАРАДА ЖАНЧЫН, ВЫЛУЧАНЫХ

Нядаўна рэдакцыя журнала сумесна з гарадскім камітэтам партыі і газетай „Комунар Магілёўшчыны“ правялі нараду вылучэнак па гораду Магілёву. Вылучэнкі расказалі аб сваёй рабоце і ў сваіх выступленнях паставілі рад патрабаванняў у дапамозе ім у рабоце. Ніжэй мы прыводзім некалькі выступленняў з гэтай нарады.

Кіраўнікі і новыя кадры

Кавалёва (намеснік дырэктара фабрыкі імя Валадарскага)

Ні ў адной краіне ў свеце жанчына не карыстаецца такімі правамі і не мае такога высокага давер'я, як у нас, у Совецкім Саюзе. Партыя, урад і асабіста таварыш Сталін робяць усё, каб жанчына сапраўды магла скарыстаць усе вялікія правы, якія дала ёй Вялікая Кастрычніцкая рэволюцыя.

Я на сабе адчуваю гэтыя вялікія клопаты аб жанчынах. Кім я была раней? З 14 гадоў пайшла працаваць хатняй работніцай, потым навучылася швейнай справе. Працавала па найму ў саматужнікаў. Толькі пры совецкай уладзе атрымала магчымасць пачаць жыць па-чалавечы. З дня арганізацыі фабрыкі, з 1929 года, я на ёй працую. Разам з фабрыкай расла. Спачатку працавала каля станка, потым інструктарам фабзавуча, інструктарам ленты. На гэтай рабоце я выхавала сотні работніц, многія з якіх зараз з'яўляюцца лепшымі стаханаўкамі.

У красавіку 1937 года мяне вылучылі начальнікам змены. Змена працавала добра і я адчувала, што на гэтай рабоце расту з кожным днём. 25 верасня мінулага году мяне вылучылі намеснікам дырэктара фабрыкі. За гэты час я, вядома, азнаёмілася са сваёй работай. Аднак, трэба сказаць, што дастатковай дапамогі ў сваім росце я не атрымліваю. Я лічу, што за прашоўшы час я павінна была ўвайсці ў курс справы па кіраўніцтву фабрыкай. На жаль, гэтага пакуль яшчэ няма.

Мне недастаткова дапамагаюць у рабоце, у прыватнасці наш дырэктар тав. Казлянскі. Ён мяне мала інструктуе і не ўцягвае ў работу па кіраўніцтву фабрыкай. Дрэнна дапамагаў у рабоце і былы сакратар парткома тав. Алейнікаў. Характэрным з'яўляецца такі выпадак. У нашым інтэрнаце раней не хапала крэслаў. Аднойчы, як толькі я стала працаваць, прыходзіць да мяне санінспектар па гэтаму пытанню. Ён заявіў, калі зараз-жа ў інтэрнаце не будзе крэслаў, то ён мяне аштрафуе. Я сказала, што грошы на крэслы пераведзены і як толькі яны прыбудуць, мы іх перавязем у інтэрнат. Санінспектар не задаволіўся маім адказам і паскардзіўся тав. Алейнікаву. Той выклікаў мяне да сябе ў кабінет і пры ўсіх абазваў бюракратам і лічыў правільнай прапанову, каб мяне аштрафаваць. Так мяне і аштрафавалі на 70 рублёў. Партком ні разу не заслухаў маёй справаздачы аб рабоце.

Я цяпер шмат увагі ўдзяляю вучобе. Вучуся ў Комвузе і дома з настаўнікам. Я ведаю, што вучоба неабходна для майго росту. Я спадзяюся апраўдаць давер'е партыі і рабочых фабрыкі, якія вылучылі мяне на адказную работу.

Першыя крокі работы вылучэнак

Лібенштэйн (намеснік начальніка матальнага цэха шоўкавай фабрыкі).

— У нас на фабрыцы за апошні час вылучана на кіруючую работу многа жанчын. Я таксама належу да гэтага ліку. Цэх у нас вялікі. Працуе ў ім 360 чалавек. Тут гаварылі таварышы аб тым, што яны не атрымліваюць дапамогі ў рабоце. Аб сабе я магу сказаць адваротнае. Мне ў рабоце дапамагаюць штодзённа. У чым выражаецца гэта дапамога? Амаль штодзённа дырэктар фабрыкі тав. Шэвялёў са мной гутарыць, распытвае аб цяжкасцях у рабоце і дае належныя парады, як іх знішчыць. Такую-ж дапамогу я адчуваю і з боку партыйнай арганізацыі.

Наш цэх за апошні час здорава падцягнуўся. Мы з'яўляемся першымі кандыдатамі на атрыманне пераходнага чырвонага сцяга. Я адчуваю недахоп у сваёй тэхнічнай кваліфікацыі; каб ліквідаваць яго, я пачала павышаць свае тэхнічныя веды. У нас, у Магілёве, яшчэ недастаткова рашуча вылучаюць работніц. Я лічу, што гарадскі камітэт партыі павінен гэты недахоп у бліжэйшы час выправіць.

МАЛА ВЫЛУЧЫЦЬ ЧАЛАВЕКА НА ТОЙ ЦІ ІНШЫ ПОСТ. ПАТРЭБНА ЯМУ ЯШЧЭ ДАПАМАГАЦЬ, СВОЕЧАСОВА ДАВАЦЬ ПАРАДУ, СВОЕЧАСОВА ПАПЯРЭДЖВАЦЬ АД ПАМЫЛАК. **(„Правда“).**

НА КІРУЮЧУЮ РАБОТУ

Апраўдаю аказанае давер'е

Баханькова А. С. (начальнік санітарнай дружыны).

—Я—жонка члена партыі, рабочага-вылучэнца. Маці траіх дзяцей. Хачу расказаць, як я стала начальнікам кадравай санітарнай дружыны. Два гады таму назад мяне запрасілі ў жакт для вучобы ў гуртку санітарнай абароны. У гэтым гуртку я даведалася аб мэтах і задачах арганізацыі Чырвонага Крыжу, што гэта арганізацыя мае вялікае значэнне ў абароне нашай краіны. Я паставіла перад сабой задачу—арганізаваць ячэйку Чырвонага Крыжа пры былым жакце № 4.

Ячэйка гэта была ў нас створана. Пры дапамозе актывістак хатніх гаспадынь тав. Гусаковай, Дворкінай, Урман мы ёю ахапілі 257 чалавек. Стварылі гурткі ГСА. Праз некаторы час 45 хатніх гаспадынь здалі нормы на значок ГСА першай ступені і 15 хатніх гаспадынь на значок ГСА другой ступені. Пры гэтым-жа жакце мы арганізавалі санаддзяленне.

Праз некаторы час мяне вылучылі начальнікам санітарнай дружыны хатніх гаспадынь. Наша каманда ўдзельнічала ў ваенна-хімічных спаборніцтвах. Мы занялі першае месца сярод гарадскіх жаночых каманд.

Нядаўна райком Чырвонага Крыжа вылучыў мяне на работу начальніка кадравай санітарнай дружыны. Я люблю абаронную работу таму, што яна ўмацоўвае нашу радзіму. Я прыкладу ўсе намаганні, каб апраўдаць сябе на гэтай рабоце.

Група вылучэнак Магілеўскай шоўкавай фабрыкі т.т. Тур, Лісунова, Гельфанд, Курцік і Медзведзева.

Штодзённа дапамагаць

Каган Сара—(начальнік цэха канфетнай фабрыкі).

З 14 год я працую на канфетнай фабрыцы. Паступіла чорнарабочай, потым працавала на станку. У 1932 годзе была вылучана зменным майстрам. А нядаўна мяне вылучылі начальнікам цэха. Я хачу расказаць аб тым, што ў нас вылучэнкі не атрымліваюць дастатковай дапамогі, у прыватнасці я гэта адчуваю на сабе.

Я, як начальнік цэха, павінна ведаць аб становішчы на фабрыцы, аб перспектывах усёй работы. Але наш дырэктар не расказвае нам усяго гэтага. Наогул трэба сказаць, што дырэктар у цэхах бывае мала, а кіруе работай толькі з кабінета.

Я працую нядаўна начальнікам цэха, а мне ўжо паспелі даць вымову з папярэджаннем па адміністратыўнай лініі. Гэта замест дапамогі ў рабоце. Гарадскі камітэт партыі павінен ведаць аб тым, як працуе кожная вылучэнка і дапамагаць ёй.

Уцягваць у грамадскую работу

Чуйко (брыгадзір з трубаліцейнага завода імя Сталіна).

— Я маці васьмі дзяцей. Муж памёр, калі дзеці былі маленькімі. Але дзякуючы клопатам совецкай улады мае дзеці выбіліся ў людзі. Старшы сын—стаханавец, комсамолец. Працуе на трубаліцейным заводзе. Другі—лейтэнант. Дачка працуе інструктарам на швейнай фабрыцы. Астатнія дзеці вучацца.

Я працую брыгадзірам. На гэту работу мяне вылучылі ў час выбараў у Вярхоўны Совет. На завод я паступіла прыбіральшчыцай. Потым работала ў станка. У 1935 годзе здала тэхэкзамен на „выдатна". Нормы выпрацоўкі я заўсёды перавыконвала ў некалькі разоў. За добрую работу мяне вылучылі брыгадзірам.

Я хачу вучыцца і прымаць удзел у грамадскім жыцці і патрабую ў гэтым дапамогі ад парткома.

У партыю Леніна—Сталіна

З 120 чалавек, прынятых у партыю за апошні час па Сталінскаму раёну (г. Менск),— 34 жанчыны. Вось некаторыя з прынятых у партыю за апошнія некалькі месяцаў.

Брамборт—стаханаўка швейнай фабрыкі імя Крупскай, ініцыятар стаханаўскага руху швейнай прамысловасці БССР. Неаднаразова прэміравана. Член комсамола з 1931 г. Прынята кандыдатам у члены партыі. Выдатная стаханаўка гэтай-жа фабрыкі тав. Завалеева (выконвала норму на 200 проц.), была членам акруговай Менскай Гарадской Выбарчай Камісіі па выбарах у Совет Нацыянальнасцей, прынята ў кандыдаты партыі. Пераведзена з кандыдатаў у члены партыі. Тав. Зарэцкая—кіраўнік тэхнічнай прапаганды на фабрыцы. Яна выдатна спраўлялася з работай намесніка старшыні выбарчага ўчастка ў часе выбарчай кампаніі.

Таксама прынята ў партыю лепшая стаханаўка гэтай фабрыкі тав. Голуб'ева, якая ў сучасны момант вылучана старшынёй фабкома і вучыцца на 3-месячных курсах старшынь фабзаўкомаў; комсамолка Зелікман, якая добра справілася са сваімі задачамі ў часе выбарчай кампаніі, як даверанаая асоба 62-га выбарчага ўчастка, прынята ў партыю і вылучана сакратаром комсамольскага камітэта фабрыкі; спачуваючая тав. Драгун, маючая 10 год вытворчага стажа, абраная ў часе перавыбараў профорганаў членам ЦП саюза, у сучасны момант прынята кандыдатам у члены партыі і вылучана на работу намесніка старшыні ЦП Саюза швейнікаў.

Прынята ў партыю комсамолка Бляхер—інжынер кандзіцерскай фабрыкі „Комунарка", якая добра спраўляецца з работай як зменны майстар цэха і з'яўляецца адной з лепшых агітатараў на фабрыцы. Прынята ў партыю стаханаўка глазіроўшчыца І ноўская Марыя, якая выкон норму на 140—160 проц., выд ная грамадчыца, член цэхав прафесіянальнага камітэта. Ус піла ў кандыдаты партыі тэх станкабудаўнічага завода Кірава комсамолка Вера Ла рэва.

Пераведзена з кандыдата члены партыі інжынер машь будаўнічага завода імя Вара лава тав. Рэйзіна. Прынята дыдатам у члены партыі сар-аўтарэманцёр Менскай тарэмстанцыі спачуваючая Ксенія Сідаровіч.

Пярвічныя партарганіза Сталінскага раёна ў сучасны манг атрымоўваюць дзес заяў ад перадавых работн стаханавак і інтэлігентак з пр бай прыняць іх у партыю. дала заяву аб прыёме яе ў тыю работніца-стаханаўка с завода „Большэвік" спачу чая тав. Хвашчэўская, пака шая ўзоры работы на выбар участку, дзе яна была давер асобай. Гэтымі днямі Бюро будзе зацвярджаць раш пярвічных партарганізацый М скага горсовета аб прыём члены партыі юрысконсул тав. Рохліну і рада іншых т рышоў.

Ёсць рад заяў аб прыём комсамол і партыю ад лепш людзей—актывістак выбар кампаніі ў пярвічныя парт ныя і комсамольскія арганізаі

Аднак неабходна адзначь што работа па прыёму лепш людзей, асабліва жанчын у р партыі, да гэтага часу пра дзена недастатковая. Асаб калі ўлічыць, што з 92 пяр ных партарганізацый—65 арг зацый не прынялі ў партык аднаго чалавека, а ў некато партарганізацыях з прыня не маецца ні адной жанчы Гэта значыць, што асоб партарганізацыі па сутнасці ч не аднавілі прыёму ў партык

Група жанчын-работніц менскай швейнай фабрыкі імя Крупскай, прынятых у рады большэвіцкай партыі. На здымку (злева направа) тт. М. Х. Рудштэйн—работніца-стаханаўка, часова выконваючая абавязкі старшыні фабкома, М. М. Брамброд—ініцыятар стаханаўскага руху ў швейнай прамысловасці БССР, М. М. Зэлікман—сакратар камітэта ЛКСМБ, М. А. Голуб'ева—работніца-стаханаўка, слухач курсаў старшынь фабкомаў пры ЦП саюза швейнікаў. На пярэднім плане—тав. Д. І. Драгун—былая работніца-стаханаўка, зараз старшыня ЦП саюза швейнікаў. Фота Б. Вернера (БСФ).

...з'яўляецца вялікім недаяшчэ і таму, што ў Стараён уваходзяць такія ...рыемствы, як кандзіцерфабрыка „Комунарка", ...ая фабрыка імя Крупскай, ...раф, пошта, АТС, Тэатр ... і балета, партарганізацыі ...ынскіх установ, гандлёвых ...зацый, школьных работ... і іншыя, дзе 70—90 проц. ...юць выключна жанчыны. ...рганізацыі маюць багацей... рэзервы для папаўнення ...радоў лепшымі жанчынаадстаўнікамі рабочага клатэлігенцыі. Адсюль наша ...—узмацніць работу па ...цыі прыёму ў партыю ...іх перадавых жанчын з ...ніц і інтэлігентак.

...упленню ў партыю лепшых ...ных справе Леніна—Сталіна ...й часта тармозяць шкодбывацельскія самастрахоўкі, асобныя комуністы, не ...очыя даваць рэкамендацыі ...аязні, „як-бы чаго не вы-

...ен партыі партарганізацыі ...кі „Комунарка" Фрыдман ...хто-б да яе не звярнуўся ...екамендацыяй, мае станы адказ: „Я цябе яшчэ не ведаю і не вывучыла". ...гар комсамольскага камігэтай-жа фабрыкі Маня сама адмаўляецца даваць ...ндацыі для ўступлення ...ю, а адначасова агітуе комуністаў даваць рэкацыі, нават тым, каму яна ...ла.

...х выпадкаў абывацельскай ...рахоўкі, непартыйных ада аказання дапамогі лепюдзям, якія хочуць уступу рады партыі, можна ...ці значна больш, як на ...е імя Варашылава, на скурае „Большэвік" і ў радзе ...пярвічных партарганіза-Сталінскага раёна. Такія ...равы нецярпімы. Неабходна

Віцебскі гарком КП(б)Б арганізаваў базавую горпартшколу па падрыхтоўцы прапагандыстаў і агітатараў без адрыва ад вытворчасці.
На здымку: Заняткі ў Віцебскай горпартшколе. Лекцыю па гісторыі ВКП(б) чытае тав. Гільіна З. І.
(БСФ).

растлумачыць усім комуністам, што свяшчэнны абавязак кожнага большэвіка штодзённа клапаціцца аб росце нашай партыі і актыўна ўцягваць лепшых перадавых людзей у рады ВКП(б), даючы ім рэкамендацыі на аснове старанного вывучэння і праверкі людзей.

Студзеньскі Пленум ЦК ВКП(б) вучыць нас большэвіцкай чуласці, індывідуальнаму падыходу да кожнага партыйнага і непартыйнага большэвіка, вучыць нас адрозніваць сяброў ад ворагаў і ворагаў ад сяброў. Рэалізуючы гэтыя рашэнні Сталінскага Цэнтральнага Камітэта ВКП(б), Сталінскі Райком партыі і ўсе пярвічныя партарганізацыі раёна прымуць усе меры да таго, каб ліквідаваць недахопы, якія ёсць у справе роста партыі, асабліва ў справе ўцягнення ў рады ВКП(б) жанчын, а таксама прымуць меры да палепшання ўсёй палітыка-выхаваўчай работы з беспартыйнымі актывісткамі.

Райком КП(б)Б і кіраўнікі пярвічных партарганізацый уяўляюць сабе, і добра ведаюць, што адным з важнейшых паказчыкаў узроўню партыйнай работы на прадпрыемстве, ва ўстанове, у ВНУ будзе служыць рост партыйнай арганізацыі за лік людзей, якія справамі даказалі сваю адданасць большэвіцкай партыі і соцыялістычнай радзіме.

В. Г. Зэльцэр. 9

На новай рабоце

Нядаўна тайным галасаваннем мяне абралі намеснікам сакратара партыйнага камітэта. Новая работа аказалася надзвычайна складанай і адказнай. Партыйная арганізацыя на фабрыцы ў нас вялікая. Прызнацца, я баялася, што з работай не спраўлюся. Спачатку адчувала вялікія

цяжкасці. Пачынала адну работу, кідала яе, прымалася за новую. Справа ішла не важна. Тады я рашыла змяніць метады работы.

Раней чым за што прыняцца, я раілася з членамі парткома, з нашым актывам. Ад іх атрымлівала многа каштоўных указанняў. Гэта дапамагло ў маёй рабоце. Зараз я працую больш планава і паслядоўна. Спачатку прадумаю справу, вывучу яе, а потым прыступаю да выканання.

Нядаўна ў часе ад'езда сакратара парткома мне прышлося яго замяніць. Я самастойна рашала складаныя партыйныя пытанні, кіравала гуртком партыйнай вучобы. Гэта самастойная работа надала мне больш упэўненасці ў свае сілы. Ніколі я не парываю сувязі з партыйнай масай, заўсёды прыбягаю к дапамозе і парадам радавых камуністак.

У рабоце мне многа дапамагае тое, што вытворчасць для мяне з'яўляецца кроўнай, роднай справай. Чатырнаццаць год прапрацавала я на розных шклаработах, пераняўшы прафесію свайго бацькі. На маіх вачах саматужная вытворчасць шкла ператваралася ў тэхнічна-ўдасканаленую, аснашчоную навейшай тэхнікай індустрыю. На шкляным заводзе я ў 1923 годзе ўступіла ў комсамол і ў 1929 годзе мяне прынялі ў рады комуністычнай партыі.

Асабіста на сябе я адчуваю, як клапатліва партыя выхоўвае маладыя партыйныя кадры. З 1931 г. на шаўковай фабрыцы мяне пачалі вылучаць з адной работы на другую, больш адказную. Працавала ў групе сыравіны аддзела забяспечання, потым начальнікам адміністрацыйна-гаспадарчага аддзела. Увесь час выконвала розныя грамадскія і партыйныя даручэнні.

Асаблівую ўвагу партыйны камітэт і я, як намеснік сакратара, надаем вылучэнню маладых кадраў. За апошнія пяць-шэсць месяцаў былі вылучаны радавыя работніцы—члены партыі, комсамолкі і беспартыйныя на кіруючыя работы. Дастаткова будзе пералічыць некалькі прозвішч. Дэпутат Вярхоўнага Совета СССР тав. Лісунова вылучана зараз на пасаду інструктара стаханаўскіх метадаў работы ў матальным цэху. Са сваімі абавязкамі яна добра спраўляецца. Да яе прымацавана 52 маладых няпопытных работніц. Некаторыя з іх пад кіраўніцтвам Лісуновай ужо сталі стаханаўкамі, астатнія выконваюць норму выпрацоўкі.

Малады інжынер Медзведзева вылучана начальнікам адбельна-сушыльнага цэха. Яна ў сваёй рабоце мае поспехі. Комсамолка Егорава вылучана памочнікам начальніка цэха. Работніца Гельфанд абрана ў склад пленума фабрычнага камітэта і працуе ў якасці намесніка старшыні фабкома. Некалькі месяцаў яна самастойна выконвала абавязкі старшыні фабкома, спраўляецца са сваёй работай. Работніца матальнага цэха тав. Варанчук вылучана майстрам цэха. Тав. Варанчук была членам беларускай дэлегацыі, якая вітала першую Сесію Вярхоўнага Совета.

Можна было-б прывесці яшчэ многа прыкладаў, якія паказваюць аб вялікім росце нашых работніц, якіх, як і мяне, выхоўвае вялікая комуністычная партыя.

А. Тур.

Магілеў.

Сапраўдная загартоўка кадраў атрымоўваецца на жывой рабоце ўне школы, на барацьбе з цяжкасцямі, на пераманганні цяжкасцей. (І. Сталін).

ВЫЛУЧЭННЕМ НЕ ЗАЙМАЮЩЦА

Мы гутарылі з сакратаром Менскага РК КП(б)Б тав. Пташкіным па пытанню, як абстаіць справа ў раёне з вылучэннем на кіруючую работу жаночых кадраў. З гутаркі выявілася зусім непрыглядная карціна.

Тав. Пташкін збянтэжана і нават некалькі чырванеючы пералічвае мізэрныя лічбы лічаных людзей—3—4 жанчын, якія знаходзяцца на кіруючых работах. Аднак ён добра ўяўляе і сам дае характарыстыку, што дзве жанчыны парторгі, якія маюцца ў раёне, т. Нёфіна (Падгайскі сельсовет), тав. Гардзі (Станькаўскі сельсовет), працуюць не горш, а бадай і лепш, чым іншыя парторгі партыйнай арганізацыі раёна. Не дрэнна працуе інструктар РК КП(б)Б—былы парторг тав. Бачурына.

Прызнае ён таксама, што маючыйся адзіны старшыня Новадворскага сельсовета тав. Недапытальская з'яўляецца адной з лепшых старшынь у раёне. Ганарыцца ён таксама і старшынёй калгаса імя Чапаева, Новасёлкаўскага сельсовета, тав. Шэўчанкай, якая паказвае ўзоры арганізаванасці і выдатнага кіраўніка калектыўнай гаспадаркі. У гэтым калгасе працадзень калгаснікаў самы большы па раёну.

І далей ён, нарэшце, прызнае:

— Што пытанне вылучэння жаночых кадраў у нас да гэтага часу не прадумана. І мы ім не займаліся.

Нельга мірыцца з такім становішчам, калі ў буйнейшым раёне БССР, які знаходзіцца пад бокам у цэнтральных арганізацый, на кіруючых работах працуе старшынёй сельсовета—1 жанчына, парторгамі—3 і старшынямі калгасаў—2 жанчыны.

У раёне не мала жанчын-удзельніц агітацыйна-прапагандысцкай работы ў часе выбараў у Вярхоўны Совет СССР. Яны былі палкімі агітатарамі за непераможны блок комуністаў і беспартыйных. Але гэтымі людзьмі не цікавіліся, іх не ведаюць. Чаго варты такі факт, калі ні тав. Пташкін, ні культпроп РК КП(б)Б тав. Улазаў не могуць сказаць нават агульнага ліку і прозвішчаў лепшых агітатараў-жанчын па раёну. Другі сакратар РК КП(б)Б тав. Палонскі не ведае жаночых кадраў у калгасах, іх здольнасцей.

Бяздушныя адносіны да вылучэнак і адсутнасць канкрэтнага кіраўніцтва і дапамогі ім у рабоце прывяло да таго, што з двух старшынь калгасаў, якія маюцца ў раёне, адна старшыня калгаса „Зара" тав. Букат падала заяву ў райза аб вызваленні яе ад работы па матывах, што ёй ніхто ў рабоце не дапамагае.

Ці ёсць у раёне жанчыны—энтузіясткі, стаханаўкі калгасных палёў, здольныя і адданыя справе, якія заслугоўваюць вылучэння на кіруючую работу? Так, яны ёсць. Іх трэба толькі ведаць, выхоўваць і яны могуць быць выдатнымі кіраўнікамі справы.

Каб у гэтым упэўніцца прывядзем некалькі фактаў. Тав. Недапытальская—член ЦВК БССР працуе старшынёй сельсовета на працягу трох год. Аб ёй добра адзываюцца выбаршчыкі сельсовета. Па яе сельсовету выдатна праведзены выбары ў Вярхоўны Совет Саюза. З такім-жа энтузіязмам і запалам працуе парторг тэрытарыяльнай партыйнай арганізацыі, тав. Нефіна. Яна арганізавала ў часе выбараў у Вярхоўны Совет агітацыйны калектыў, які і зараз праводзіць вялікую агітацыйную работу па падрыхтоўцы да выбараў у Вярхоўны Совет БССР. Ці-ж гэтых людзей нельга было-б вылучыць на яшчэ большую работу?

У раёне налічваецца 183 калгасы, амаль ва ўсіх калгасах ёсць фермы. Там маюцца такія людзі, якія паказваюць вялікую прадукцыйнасць працы,—стаханаўкі соцыялістычнай жывёлагадоўлі і палёў, як Бачыла Ольга—стаханаўка, звеннявая калгаса імя Сталіна, Кайкаўскага сельсовета, тав. Каленік Марыя—стаханаўка-цялятніца гэтага-ж калгаса. Гэтымі людзьмі не цікавяцца. У Райза нават не ведаюць агульнага ліку жанчын—загадчыкаў ферм.

Разгорнутае соцыялістычнае будаўніцтва па раёну, за ўзорную падрыхтоўку да веснавой сяўбы ахапіла шырокія слаі калгасніц. У працэсе спаборніцтва выявіліся жанчыны, якія па-большэвіцку змагаюцца за 7—8 мільярдаў пудоўсталінскагаўраджаю. З гэтых людзей можна выбраць сапраўды здольных энтузіястак, да канца адданых справе Леніна—Сталіна, якіх можна без усякага сумнення вылучаць на адказную кіруючую работу ў калгасах.

Менскі райком партыі і яго сакратары тт. Пташкін і Палонскі забылі ўказанне таварыша Сталіна, „што жанчына ў калгасе вялікая сіла. Трымаць гэтую сілу пад спудам, значыць дапусціць злачынства. Наш абавязак заключаецца ў тым, каб вылучаць наперад жанчын у калгасах і пусціць гэту сілу ў справу".

Г. Каган.

Комсамолка Зурыат Шоштаева кіруе калгасным гуртком па ліквідацыі непісьменнасці ў ауле Джэгуцінскім (Карачаеўская аўтаномная вобласць).

На здымку: Заняткі гуртка. Злева направа калгаснікі Байбанава, Зурнат, Кубанаў Джамай і Эдзіеў Абі.

Фота Гурэева (СФ).

Старшыня Сасніцкага сельсовета, Полацкага раёна, член ЦВК БССР тав. Сабаленка Е. І. праводзіць гутарку з калгасніцамі аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР. Белсаюзфота.

Рыхтуемся да выбараў у Вярхоўны Совет БССР

Насельніцтва Рыжкаўскага сельсовета разам з усімі працоўнымі Беларусі рыхтуюцца да выбараў у соцыялістычны Парламент ордэнаноснай Совецкай Беларусі.

Выбары ў Вярхоўны Совет БССР—гэта яркая падзея ў жыцці беларускага народа, бліскучая ілюстрацыя перамогі ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Падрыхтоўку да выбараў у Вярхоўны Совет БССР па сельсовету мы распачалі зараз-жа пасля сканчэння Сесіі ЦВК БССР. Па калгасах сельсовета працуюць арганізаваныя 15 гурткоў. Мы перад сабой паставілі задачу—не прапусціць ні аднаго чалавека, які-б не займаўся ў гуртку і не вывучыў Канстытуцыю БССР і Палажэнне аб выбарах. Для кіраўніцтва гурткамі ў нас падабрана 27 агітатараў з комуністаў, комсамольцаў і беспартыйных, сярод іх—8 жанчын. Заняткі ў гуртках праходзяць добра, іх актыўна наведваюць усе калгаснікі.

Падрыхтоўку да выбараў у Вярхоўны Совет БССР мы цесна звязваем з падрыхтоўкай да веснавой сяўбы. Мы ставім перад сабой задачу—у першым годзе трэцяй Сталінскай пяцігодкі дабіцца яшчэ большага ўраджаю, чым у 1937 г., зрабіць працадзень калгасніка больш поўнаважкім.

Рыжкаўскі сельсовет заключыў дагавор на соцыялістычнае спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да вясны са Шклоўскім сельсоветам. Калгаснікі нашага сельсовета ў гэтым спаборніцтве ўзялі на сябе абавязацельства—сабраць з гектара ў сярэднім ільнавалакна не менш 6 цэнтнераў і не ніжэй 18 нумара; зернавых—не менш 17 цэнтнераў; бульбы не менш 220 цэнтнераў; дабіцца сярэдняй вагі на працадзень не ніжэй, як 5 кілограм зернавых, 10 кілограмаў бульбы і 2 р. 50 к. грашыма, а калгаснікі калгаса „Іскра“, якія ў 1937 г. атрымалі па 3 кілограма збожжавых і 5 рублёў грашыма, узялі абавязацельства каштоўнасць працадня павялічыць у два з паловай разы.

Па калгасах сельсовета арганізавана 31 стаханаўскае звяно, з якіх 25 жаночых. Паміж звеннямі і ўнутры звенняў арганізавана спаборніцтва на лепшую падрыхтоўку да веснавой пасеўнай кампаніі і да выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

У выніку разгарнуўшагася спаборніцтва па калгасах сельсовета ўжо праведзена значная работа; угнаенняў на поле трэба было вывезці 5,5 тысяч тон, а вывезена—9 тысяч тон; сабрана 70 тон попелу і 6 цэнтнераў курынага памёту. Насеннем забяспечаны ў дастатковай колькасці. Яно ўсё ачышчана, абменена на гатунковае, праверана на ўсхожасць.

Як старшыня сельскага совета, я стаўлю перад сабой задачу: да выбараў у Вярхоўны Совет БССР вылучыць на адказныя работы па сельсовету жанчын. Трэба сказаць, што вылучаць ёсць каго. За апошнія гады выросла вялікая колькасць актывістак з ліку стаханавак-калгасніц. Каля 60 чалавек актывістак налічваецца ў нас у сельскім совеце. Вось, напрыклад, тав. Кашо, з калгаса імя Леніна. Яна была звеннявой, потым брыгадзірам. У калгасе ўвесь час стаханаўка, зараз мы яе рэкамендуем старшынёй калгаса. Або Падгорная Марыя з калгаса „Усход“, стаханаўка, брыгадзір у мінулым годзе, а зараз абрана старшынёй калгаса.

З энтузіязмам і гордасцю выбаршчыкі Рыжкаўскага сельсовета выканаюць і на гэты раз свой ганаровы абавязак і выкарыстаюць тыя велізарныя правы, якія прадаставіла ім Сталінская Канстытуцыя, з бязмежнай любоўю аддадуць свае галасы за лепшых з лепшых сыноў нашай Беларускай рэспублікі.

Паўлючэнка М.

Шклоўскі раён.

Адна з многіх

Анна Пятроўна поўная энергіі і энтузіязма. Яна заўсёды ў клопатах і ў рабоце. Рабочы дзень яе запоўнен вырашэннем рада гаспадарчых спраў. Вось яна з членамі праўлення і брыгадзірамі абмяркоўвае мерапрыемствы па падняццю ўраджайнасці ў калгасах. Неўзабаве Анну Пятроўну можна бачыць, як яна праводзіць гутарку з конюхамі, як лепш даглядаць коней, каб на „выдатна" падрыхтавацца да веснавой сяўбы.

Ды і ці мала ёй клопатаў! На спяшаецца агледзіць, як ялятніцы падрыхтавалі ўтульнае і цёплае памяшканне для устрэчы новага прыплода.

Па вечарах Анна Пятроўна аксама занята. То яна спяшаецца на бюро РК ЛКСМБ або а прэзідыум РВК (яна з'яўляецца членам бюро РК і прэзідыума РВК), то яна праводзіць заняткі ў палітшколе з комсольцамі.

Затое яна сваё цяжкае мінулае спамінае зусім не з ахвотай. ям'я яе бацькі Пятра Цыбульскага складалася з 13 асоб. Ад ала да вялікага вымушаны былі трачыць. Лёс Анны Пятроўны ыў такім-жа. За кавалак хлеба батрачыла ў вёсцы Паўлоўчыцы, але аднойчы не вытрымала яна, падростак-дзяўчына, цяжкай непасільнай работы і ўцякла ад гаспадара.

Папрацавала невялікі час у соўгасе „Івань", і як толькі бацька ўступіў у калгас у 1931 г., яна тут-жа пераходзіць у калектыўную сям'ю з тым, каб разам будаваць сваё шчаслівае жыццё.

Год уступлення ў калгас для Анны запаўняецца і другой вялікай радаснай падзеяй. У гэты год Ленінскі комсамол прыняў яе ў свае рады. Вось з гэтага часу пачынаецца свядомае жыццё Анны Пятроўны.

Комсамольская арганізацыя даручыла ёй адказны ўчастак работы—калгасную ферму. Анна з гэтай работай справілася з гонарам. Вясной яе, як лепшага змагара за заможнае жыццё калгаснікаў, перакінулі кіраўніком паляводчай брыгады. Анна і тут у перадавых радах.

Сваю вытворчую работу ў калгасе яна заўсёды ўмела спалучае з работай над сабой для падняцця свайго палітычнага і культурнага ўзроўню. Старанна вучылася сама і вучыла моладзь калгаса.

За ўдарную работу ў калгасе раённыя арганізацыі паслалі Анну Пятроўну ў 1934 г. на курсы інструктараў РВК; там яна таксама вучылася на „выдатна". Прайшоў час вучобы непрыкметна, і яна вярнулася ў раён. Выбаршчыкі Казловіцкага сельсовета абралі яе сваім старшынёй.

— Першыя крокі ў рабоце былі цяжкія,—гаворыць тав. Цыбулька.—Але няма такой крэпасці, якой большэвікі не ўзялі-б.

За тры гады кіраўніцтва сельсоветам Анна стала яшчэ больш энергічнай, рашучай і непрымірымай да ворагаў народа. І нязмерна выраслі яе арганізатарскія здольнасці.

З асаблівым гонарам Анна ўспамінае дзень выбараў у Вярхоўны Совет Саюза.

— З якой цеплынёй і радасцю я аддавала свой голас за кандыдатаў блока комуністаў і беспартыйных. Я галасавала за таго, хто выхаваў мяне і хто адкрыў мне светлы шлях жыцця—за непераможную партыю Леніна—Сталіна, за любімага і роднага настаўніка і друга таварыша Сталіна.

І. Сыман, І. Вечар.

Слуцк.

Нядаўна ў Менску адбылася алімпіяда мастацкай самадзейнасці членаў арцеляў Белскурпрамсаюза.
На здымку: Калектыў Бабруйскай арцелі „Сіла працы" выконвае чырвонафлоцкі танец „Яблычка".
Фота Л. Мазэлева (БСФ).

НАМ ПІШУЦЬ

ШКОДНІЦТВА НЕЛІКВІДАВАНА

Я ўвесь час працавала ў соўгасе імя Свердлова. У мінулым годзе, з прычыны ліквідацыі нашага соўгаса, Нзркамсоўгасаў накіраваў мяне на работу ў соўгас „Зарэчча“, Смалявіцкага раёна.

Я хачу расказаць, як мне, ордэнаносцы, дапамагаюць у рабоце. У соўгасе „Зарэчча“ я ўжо некалькі месяцаў. Ў новым соўгасе, у новай абстаноўцы вельмі часта сустракаюцца розныя цяжкасці. Ва ўсім адчуваеш, што патрэбна дапамога. А вось гэтай дапамогі і няма. За ўвесь час ні дырэктар соўгаса тав. Глушанін, ні партыйная арганізацыя мне ні ў чым не дапамаглі.

У нас на ферме ёсць многа непарадкаў. Некаторыя работніцы нядобрасумленна адносяцца да сваёй работы. Зробіш ім заўвагу, што няправільна ты робіш і пачнеш тлумачыць, як трэба рабіць, а яна цябе не толькі не выслухае, а нават вылае, назаве ўсякімі пахабнымі словамі. Склокі, лаянка—гэта звычайнае з'явішча. А вось ліквідаваць іх, знішчыць непарадкі на ферме мне ніхто не дапамагае.

Акрамя гэтага да апошняга часу на ферме не знішчана шкодніцтва. Сюды пралезлі людзі, якія спецыяльна стараюцца падарваць, перашкодзіць у рабоце. Вось прыклад. З 25 студзеня гэтага года па 7 лютага я не была ў соўгасе. Ездзіла ў Маскву на нараду знатных людзей жывёлагадоўлі. У гэты час маю лепшую рэкардыстку „Кароткую“ атруцілі і перабілі ёй нагу. На такі факт нават не рэагавалі ні дырэктар, ні партыйная арганізацыя соўгаса. Такое з'явішча нецярпіма. Яны дапамагаюць класаваму ворагу сарваць выкананне тых абавязацельстваў, якія я ўзяла на сябе.

Ордэнаносец Шамко.

РЫХТУЕМСЯ ДА ВЫБАРАЎ

У часе падрыхтоўкі да выбараў у Вярхоўны Совет СССР мы, хатнія гаспадыні, акуратна наведвалі гурток па вывучэнню Палажэння аб выбарах і Сталінскай Канстытуцыі.

Заняткі праводзіў з намі тав. Сацэвіч. Ён вельмі ярка і маляўніча растлумачваў нам Сталінскую Канстытуцыю, расказваў аб выбарах у капіталістычных краінах. Мы самі расказвалі аб сваім мінулым гаротным жыцці, параўноўвалі яго з цяперашнім. Заняткі праходзілі жыва і актыўна. Мы адчувалі свой палітычны рост.

У дзень выбараў у Вярхоўны Совет мы арганізавана з аркестрам пайшлі на выбарчы ўчастак і з гонарам аддалі свае галасы за дастойных сыноў нашай радзімы. Гэты дзень на ўсё жыццё запомніўся нам. Мы бачылі чулівыя сцэны, калі старыкі і старухі, апусціўшы канверты ў урны, выказвалі сваю бязмежную ўдзячнасць таварышу Сталіну за шчаслівую старасць. Да іх былі праяўлены выключныя клопаты, за імі ездзілі легкавыя машыны, прывозілі і адвозілі іх на выбарчы ўчастак.

Заняткі гуртка пасля выбараў мы не спынілі. Мы ўвесь час акуратна прадаўжаем займацца, вывучаем матэрыялы VIII Сесіі ЦВК БССР XI склікання, „Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет БССР“, чытаем газеты і іншыя матэрыялы. Рыхтуемся таксама арганізавана прыйсці і на выбары ў Вярхоўны Совет Беларусі.

У гуртку мы таксама азнаёміліся з працэсам над „права-трацкісцкім блокам“. Усе мы ахоплены гневам і глыбокай нянавісцю да гэтых здраднікаў, якія рабілі гнусныя зладзействы. Не хапае слоў, каб выказаць сваю пагарду і нянавісць да гэтых бандытаў, страціўшых чалавечае аблічча.

Няхай ведаюць подлыя фашысцкія вырадкі, што ім ніколі не давядзецца заняволіць свабодны совецкі народ. Нашу цудоўную краіну будзе абараняць увесь народ да аднаго чалавека, і мы, хатнія гаспадыні, таксама не адстанем, а разам са сваімі мужамі, сынамі станем на яе абарону. Мы бярэм абавязацельствы як след вывучыць вайсковую справу, каб быць гатовымі ў любую мінуту стаць на абарону нашай бацькаўшчыны.

Хатнія гаспадыні: Сіндэр, Лішанская, Склярава.

Менск.

КОМСАМОЛКА ДЗІСНЕР

Соню Дзіснер на фабрыцы імя Кагановіча ведаюць усе рабочыя. Яе ведаюць, як адну з лепшых стаханавак, як актыўную добрую комсамолку.

На 200 процантаў і больш Соня выконвае сваё вытворчае заданне. Гэтага яна дабілася дзякуючы сумленным адносінам да работы. За поўгадзіны да пачатку работы яна прыходзіць на фабрыку, змазвае машыну, падрыхтоўвае неабходныя матэрыялы. Яна імкнецца працаваць бесперабойна 420 мінут.

Аднойчы нехта заявіў адміністрацыі, што Дзіснер прыпісвае сабе прадукцыю. Соня пакрыўдзілася за такую паклёпніцкую заяву, але працягвала працаваць з такой-жа энергіяй. Пры праверцы аказалася, што гэта паклёп на стаханаўку.

Соня Дзіснер зараз комсамольскі арганізатар. З работай яна добра спраўляецца. Нядаўна Кагановіцкі райком комсамола даў ёй рэкамендацыю для ўступлення ў кандыдаты партыі. Гэта велізарная радасць для Соні.

Е. Друкт.

Менск.

МАЕ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ

Я вывучыла і добра ўладаю ўсімі сельскагаспадарчымі машынамі, а больш за ўсё люблю і працую на самай складанай машыне—камбайне. Памятаю, у мінулым годзе першы раз выехала ў поле. Калгаснікі абкружылі нас, любаваліся і цікавіліся работай.

— Паглядзіце вы на Кацю, яна і камбайнам можа кіраваць, як і трактарам. Любая машына слухае яе,—гаварылі калгаснікі.

А я працавала старанна. За 19 толькі дзён я ўбрала 170 гектараў зернавых, пры норме ў 80 гектараў. План перавыканала больш чым у два разы.

Адначасова я старалася навучыць працаваць на камбайне сваю памочніцу. Перадавала свой метад работы, вучыла абыходзіцца з камбайнам, тлумачыла кожны рух, кожную частку камбайна. І яна аўладала камбайнам не дрэнна. У гэтым годзе яна самастойна, як і я, павядзе камбайн.

Зараз пераключылася на работу па падрыхтоўцы да веснавой сяўбы. Працую ў брыгадзе па рамонце трактароў. Дапамагаю трактарыстам у іх рабоце. Таксама я праверыла сваю машыну—камбайн, дапамагла праверыць камбайн сваім таварышам камбайнеркам.

Якія абавязацельствы я бяру на 1938 год? Першай выехаць у поле і дапамагчы калгасам справіцца з пасевам ва ўстаноўлены ўрадам тэрмін. У часе ўборачнай убраць сваім камбайнам 250 гектараў зернавых. Па сканчэнню ўборкі пераключыцца на ворыва і на трактары „ХТЗ“ узараць 600 гектараў.

Ордэнаносец К. Мандрукевіч.

Заслаўская МТС.



На здымку: Сям'я калгасніка калгаса імя Валадарскага Магілёўскага раёна ў выходны дзень. Злева направа калгаснік—стаханавец П. І. Глушакоў, яго маці—Глушакова П. Г., 90-гадовая старуха і жонка М. М. Глушакова слухаюць па радыё канцэрт Маскоўскай станцыі „Комінтэрн“.

Фота Я. Горэвога (БСФ)

Выконваю ганаровую справу

Ворагі народа, шпіёны, дывэрсанты і шкоднікі не мала нашкодзілі ў сельскай гаспадарцы Беларусі. Яны моцна прыклалі свае брудныя лапы і да соцыялістычнай гаспадаркі ў нашым соўгасе „Судкова“. Заразілі рагатую жывёлу інфекцыйнай хваробай, туберкулёзам. У выніку прыплод ад іх—цяляты хілыя, змораныя і зусім слабыя.

Адсюль перада мной паўсталі складаныя і адказнейшыя задачы—ліквідацыя і выкарчаванне да канца шкодніцтва ў жывёлагадоўлі соўгаса. Упартай работай па ліквідацыі вынікаў шкодніцтва я дабілася значных поспехаў у сваёй практычнай рабоце.

У соўгасе я працую над вырашчваннем маладняка. У мой абавязак уваходзіць вырошчваць маладняк да 5 месяцаў. Работа складаная і даволі адказная. Для гэтага неабходна, каб пры кармленні, а таксама і ў цялятніку захоўвалася выключная ўзорная чыстата, а галоўнае трэба прытрымліваць цвёрды рэжым кармлення.

Я гэта раблю наступным чынам. З першага дня ацёла цялят адбіраю ад маткі і кармлю іх ўручную. Як правіла, дзесяць дзён з дня нараджэння цяля я кармлю цёплым малаком з-пад каровы. Пасля чаго пераводжу яго на агульнае малако, прытым штодзённа павялічваю норму кармлення. Праз месяц даю, акрамя малака, пойла і сена. Так я раблю на працягу некалькіх месяцаў. Калі цялё дасягае пяцімесячнага ўзросту, я пераводжу яго ў другую групу. Там яно корміцца пераважна пойлам і сенам.

За мінулы 1937 год я вырасціла 118 цялят. За ўвесь час не было ні захворванняў, ні адыхода. У гэтым годзе ў маёй групе налічваецца ўжо 67 штук маладняка. Усе свае сілы і здольнасці прыкладаю, каб поўнасцю іх захаваць.

Такіх поспехаў у сваёй рабоце я дабілася таму, што даручаную мне работу я люблю і адношуся да яе з вялікай увагай і адданасцю. За выдатную работу і за добрыя паказчыкі ўрад Беларусі ў часе выстаўкі „БССР за 20 год“ прэміраваў мяне.

К X з'езду профсаюзаў СССР, дэлегатам якога я абрана ад профсаюзаў Беларусі малочных соўгасаў, я абавязваюся дабіцца яшчэ большых паказчыкаў у сваёй рабоце. Бяру таксама на сябе абавязацельства — перадаваць свой метад работы маім цялятніцам, якія са мной працуюць. Я ўжо маю „выхаванак“ Дар'ю Курганаву, Надзю Самасуд, якія паказваюць добрыя ўзоры ў сваёй рабоце. Я імі ганаруся, бо іх вучыла працаваць.

За аказаную павагу і клопаты аба мне партыі і ўрада я абяцаю не шкадаваць сваіх сіл, а калі патрэбна будзе—аддам і жыццё на карысць соцыялістычнага будаўніцтва.

Ордэнаносец Канстанцінава.

Хойніцкі раён.

Работніцы аб журнале

На нараду, скліканую рэдакцыяй журнала „Работніца і калгасніца Беларусі“, задоўга да пачатку з'явіліся работніцы, стаханаўкі і ўдарніцы фабрыкі „Профінтэрн“. Яны прышлі на гэту нараду, каб падзяліцца з рэдакцыяй вопытам сваёй стаханаўскай работы, расказаць аб перашкодах у рабоце, аб сваім радасным і заможным жыцці і прад'явіць свае ўзросшыя патрабаванні да журнала.

Першай бярэ слова стаханаўка Малання Варачаева. Яна гаворыць аб стаханаўскім руху на фабрыцы, аб выдатнай рабоце стахановак.

— Але ў нас ёсць і многа недахопаў, аб чым таксама трэба гаварыць ва ўвесь голас,—працягвае сваё выступленне яна.—Рэдакцыя журнала „Работніца і калгасніца Беларусі“ можа нам у многім дапамагчы. Але, на жаль, сувязь рэдакцыі з нашай фабрыкай недастатковая. Вось, напрыклад, такое пытанне, як палітвыхаваўчая работа на фабрыцы. Палітыка-выхаваўчая работа на фабрыцы ў нас пастаўлена дрэнна. Уся работа праводзіцца толькі ў часе абедзенага перапынку, праводзіцца наспех. Пры фабрыцы няма нават клуба. Некалькі год збіраецца Белшвейтрэст будаваць клуб, але далей смет і планаў не пайшлі. Трэба, каб рэдакцыя дапамагла нам разбіць той бюракратызм, які створан вакол пабудовы клуба для фабрыкі.

Стаханаўка Елена Матвеева рэзка крытыкуе работу журнала „Работніца і калгасніца Беларусі“.

— Журнал паказвае на сваіх старонках прыклады работы лепшых людзей, мабілізуе жанчын на выкананне рашэнняў партыі і ўрада. Гэта станоўчы бок работы журнала. Але журнал вельмі часта спазняецца, не паспявае за падзеямі. І тады яго не цікава чытаць. Я яго выпісвала і чытала з 1933 года, а на гэты год не падпісалася толькі з прычыны яго спазнення,—кажа тав. Матвеева.—Трэба зрабіць журнал больш цікавым.

За ёй бярэ слова тав. Блюма Фетар. Яна гаворыць аб тых клопатах, якімі абкружана жанчына ў СССР і на вытворчасці і ў быту.

— Праца наша радасная, мы ведаем, што працуем на сябе, на сваю любімую радзіму,—кажа тав. Фетар.—Совецкая жанчына зараз не адзінокая, як раней. Яна роўнапраўны член грамадства. Хіба мы маглі раней гаварыць аб журнале або яшчэ аб чым-небудзь падобным? Не.

— Мае некаторыя заўвагі аб журнале „Работніца і калгасніца“. У большасці рэдакцыя змяшчае матэрыялы аб станоўчых фактах. Трэба паказваць і добрыя прыклады, але разам з тым неабходна ўскрываць і тыя недахопы, якія ў нас яшчэ маюцца.

У далейшым я абяцаю трымаць цесную сувязь з журналам, часта пісаць аб тых недахопах, якія маюцца яшчэ на нашай фабрыцы „Профінтэрн“, аб перашкодах у нашай рабоце.

Наступнай выступае Юля Катовіч. Яна расказвае аб сваім ранейшым жыцці, аб тым, як ёй раней хацелася вучыцца, але беднасць і недастачы перашкаджалі гэтаму жаданню.

— Да рэдакцыі журнала ў мяне дзве просьбы: пабольш змяшчаць у журнале артыкулаў навуковага, медычнага і іншага характару. Бо нашы жанчыны выраслі, і маленькія допісы чытачак не задавальняюць. І падругое—больш трэба асвятляць жыццё жанчын капіталістычных краін. А то гэты раздзел вельмі рэдка бывае ў журнале.

З вялікім хваляваннем расказвае стаханаўка Фаня Нірман аб радаснай працы ў совецкіх умовах на соцыялістычных прадпрыемствах, расказвае аб тым шчаслівым жыцці, якім жывуць працоўныя жанчыны ў СССР.

— Я сама працую з адзінацаці год, добра памятаю, у якіх жудасных умовах працавалі мы раней. Зусім іншае зараз.

На фабрыцы я норму выконваю на 200 проц. Стаханаўкай стала з самага пачатку разгортвання стаханаўскага руху. Працавала раней на адной ленце, паспрабавала ўзяць другую—і зараз добра спраўляюся на двух. Работу сваю люблю. Хачу яшчэ вучыцца, бо ў дзяцінстве не давялося.

— Мае заўвагі да журнала „Работніца і калгасніца Беларусі“. Арганізоўваць на старонках журнала абмен вопытам стаханавак, каб можна было аб сваім вопыце расказаць і ў другіх павучыцца.

З вялікай любоўю гаворыць Лея Левінтава аб любімым Сталіне, які з такой любоўю адносіцца да людзей.

— Я засталася ўдавой з чатырма дзяцьмі,—расказвае тав. Левінтава.—Раней-бы я загінула і ніхто-б аба мне не падумаў. А пры совецкай уладзе мне дапамаглі выхаваць маіх дзяцей. Зараз адзін ужо вучыцца ў ваеннай школе, другі працуе на фабрыцы „КІМ“, а двое яшчэ вучацца ў сямігодцы. Дзеці мае не адчуваюць, што ў іх няма бацькі, бо яны акружаны клопатамі з боку партыі і ўрада і бацькі ўсіх працоўных—таварыша Сталіна. Яны ні ў чым не церпяць недастатку. Я прыкладу ўсе намаганні, каб з маіх дзяцей выхаваць герояў нашай краіны,—горда заканчвае сваё выступленне тав. Левінтава.

Усе прысутныя рэзка крытыкавалі работу рэдакцыі журнала, патрабавалі зрабіць журнал больш цікавым, больш аператыўным. Абяцалі самі ў далейшым трымаць цесную сувязь з журналам.

Пятроўская

Віцебск.

Успаміны палкоўніка Алены

Бялюдная ціш, толькі вецер б'е ў дзверы
Ла вокны мітусіцца снегаварот
е пурга згаладаўшымся зверам,—
ыружвае з ветрам ліхі карагод.

Гуць за акном стогадовыя дрэвы,
Ікбыццам на іх наляцеў буралом...
Ислухаем іх неспакойныя спевы,—
Ін акружаюць наш каменны дом.

Лакоўнік Алена гаворыць пра роты,
Ракавае шчыра пра лепшых стралкоў:
— Штодзённа заняты мы ўпартай работай
Рытуем выдатных байцоў-снайпероў.

Ракавае мне, як з байцамі учора
Налыжах хадзілі ў бялюткі прастор.
Ікзечарам шумны і радасны горад
Ліціцца ў прыгожасці электра-зор...

Вецер-буран не сціхае. Паўз сцены
Ус свішчуць і кружаць з снягамі вятры.
Гуалі, як песні, ўспаміны Алены
Пр слаўны жыццёпіс свой, праўду і быль:

— Я помню такое-ж неціхае ранне,—
Гаорыць Алена,—ў сямнаццаты год.
Ятолькі ледзь-ледзь занялося світанне,
М вышлі з брыгадай ў адважны паход.

Ютае ранне для нас было домнай,
Ў кую рудою цякла наша кроў.
Шпер як сама нават тое прыпомню,—
Зецца, што ўсё гэта вымысел сноў.

Нзек я запомніла бераг Урала,
Де бой завязаўся пад гром кананад...
Вца ў сваіх хвалях там шмат пахавала
Гўшых у схватцы ахвяраў—салдат.

Гаціўнік, раз'юшаны буйнай няўдачай,
Інуўся нас сціснуць абходным кальцом,
Гымусіць усіх нас на пленную здачу
Взлітасна грозным гарматным агнём.

Мы-ж хутка агонь свой знішчальны адкрылі,
Іпнога хоць мелі ў брыгадзе ахвяр,
Ае ўсё кальцо яго хутка разбілі...
Угэтым баі мяне раніла ў твар.

Я куля шальная пакінула з рысай
Ой твар,—мне было дзевятнаццаць гадоў.
ды мне першы раз прышлося памыцца
Ральскай вадою, каб з твару змыць кроў...

Раз дзень,—на рассвеце праклятыя ночы,
лі ўжо дагарваў наступны наш бой,
крыў назаўсёды арліныя вочы
Найлепшы таварыш, пакойны муж мой...

не сціснула сэрца пякучасцю, болем,
слёзы каціліся проста ў агонь,
то больш не праносіў яго ўжо над полем
аварыш і друг баявы—яго конь.

Ольга Якаўлеўна Папова—лепшы інструктар-лётчыца Гомельскага аэраклуба. Фота В. Лейна

Ой, шмат я сама па дарогах разрытых
Назад адсылала бацькоўскіх лістоў,
Бо ўсе яны йшлі да герояў... забітых,
Сабе не знаходзячы ўжо адрасоў.

* * *

Такія раблю я сягоння ўспаміны,
Бо гэта жыццёпіс чырвоных байцоў;
Магутнейшым будзе ён кожнае сілы
У новых прывідах сусветных баёў.

Выхоўваю я патрыётаў—герояў
Такіх, як тады вырасталі ў баях
За Буг і Кахоўку, Урал і Прымор'е—
На пройдзеных з славай крывавых палях,

Мы ў голадзе, холадзе перамаглі
Таму, што нас Ленін і Сталін вялі
У сонцам залітыя, ясныя далі,
Што сёння ўжо ззяюць на нашай зямлі.

За іх так кіпелі крывавыя бітвы
І будуць яны яшчэ грозна кіпець;
І той, хто быў намі тады недабіты,
Павінен цяпер напаткаць сваю смерць.

Няхай толькі бліснуць фашысты клінкамі,
Трывога няхай прабяжыць па мяжы,—
Я зноў пайду ў бой з баявымі палкамі,
Каб раз назаўсёды сцерэць рубяжы.

Тадор Алесін.

027

ЦАНА 20 кап. У гэтым нумары бясплатна дасылаецца ўкладка-выкрайка

НАРКАМХАРЧПРОМ СССР
ГАЛОЎПАРФЮМЕР
ТЭЖЭ
АД ЗАГАРУ
АД ВЯСНУШАК
ДЛЯ БЕЛІЗНЫ І МЯККАСЦІ СКУРЫ
ЛЕПШЫЯ КРЭМЫ

Адказны рэдактар Г. В. КАГАН

Адрас рэдакцыі: Менск, Дом працы, 3-ці паверх, пакой 8. Тэл. 24-058. 24-070.

Друкарня імя Сталіна. Зак. № 3299. Тыраж 12000 экз. Уп. Галоўлітбела № 4254.
Здана ў друкарню 17/III-38 г. Падпісана да друку 28/III-38 г. У нумары 2 1/2 арк. 120.140 друк. знакаў